УДК 629. 735

## Беларуская дыяспара ў краінах Балтыі

Лойка Т.В.
Баларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

У краінах Балтыі пражывае каля 150 тыс этнічных беларусаў, у тым ліку у Латвіі – 90 тыс., у Літве – 42,9 тыс., у Эстоніі – 17 тыс. Колькасць беларусаў адносна усяго насельніцтва тут значна большая, чым у іншых рэгіенах. Беларуская прысутнасць у гэтых краінах складвалася на працягу стагоддзяў з эмігрантаў, перасяленцаў савецкага перыяду і карэнных жыхароў сумежных тэрыторый. Пік этнічнага адраджэння беларускага замежжа прыпадае на 90-е гады мінулага стагоддзя. Прынцыповае значэнне пры гэтым мела змяненне адносін да дыяспары на дзяржаўным узройні. Зараз у Літве дзейнічае 17 беларускіх таварыстваў, у Эстоніі – 9, у Латвіі – 8. Іх намаганнямі ладзяцца народныя святы, фестывалі беларускай песні, рыхтуюцца теле – і радыепраграмы, выдаюцца газеты. Штогод праводзяцца святы Дня Незалежнасці, Свята Перамогі, у 2007 г. адзначаліся юбілеі Я.Купалы і Я.Коласа. У Вільні ужо другое дзесяцігодзе працуе адзіная у замежжы беларуская сярэдняя школа.

Беларускія суполкі трох краін падтрымліваюць сталыя стасункі паміж сабой, праводзяць культурныя акцыі, збіраюцца на канферэнцыі, рэалізуюць праекты. Супрацоўніцтва з гістарычнай Радзімай выяўляецца ў пабрацімскіх сувязях гарадоў і рэгіенаў, абмене творчымі калектывамі, удзеле ў фестывалі “Славянскі базар”, арганізацыі турыстычных паездак і г.д. Пасвяхова наладжвае кантакты з Беларуссю асацыяцыя прадпрымальнікаў-беларусаў Латвіі, “Беларускі шлях”.

Разам з тым у Латвіі і Эстоніі па-ранейшаму існуе праблема грамадзянства. Праўда, талерантныя беларусы прыстасоўваюцца да мясцовых умоў і не абвастраюць адносін з уладамі, аднак каля 500 чалавек штогод вяртаюцца на Беларусь. Для тых, хто застаецца беларусам у замежжы, істотнай праблемай з’яўляецца недахоп фінансавых сродкаў для плённай працы.